Сапа 10 hr. Pieresyłka apłačana gotoŭkaj

Nr. 46 (687). Wilnia, Niadziela 15 Listapada 1936 h. Hod XII (XX)

БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i litaraturnaja hazeta.

Adras Redakcyi i Administracyi: WILNIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčyniena ad 9 hadz. ran. da 4-aj uwieč.

HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ.

Košty wydawańnia pakrywajuć składki. Składka u hod 4 zał., na paŭhoda — 2 zał., na 3 miesiacy — 1 zał.

БЕЛАРУСЫ! Дамагайцеся для сваіх дзяцей школы ў роднай мове — падавайце школьным уладам дэклярацыі на беларускую школу!

Польскае Праваслаўе

Польскае Праваслаўе — гэта нешта настолькі сапраўды новае і нават ненармальнае, што проста ня верыцца, каб аб ім можна было паважна гаварыць і прабаваць праводзіць яго ў жыцьцё. Тымчасам сяньня ўжо аб гэткім дзіўным Праваслаўі ў польскай і украінскай прэсе шмат пішыцца, а ў некаторых польскіх і праваслаўных кругох грамадзянства нямала гаворыцца, як аб нечым, што калі яшчэ і ня ёсьць фактам рэальным, дык што ёсьць ужо фактам юрыдычным. Дагэтуль было нам ведама, што, напрыклад, у Беластоку ў праваслаўнай царкве робяцца пробы польскіх казаньняў, што ў Варшаве праваслаўныя студэнты багасловы між сабой, у сваім прыватным жыцьці, гавораць папольску і што гэта яны робяць быццам затым, што такая ёсьць воля іх духоўнай улады, але паважнейшага ў гэтай справе дагэтуль ня чулі мы нічога. Апошнім-жа часам паявіліся і паважнейшыя рэчы.

Нядаўна Сьвяшч. Сынод Праваслаўнай Царквы ў Польшчы пацьвердзіў літургічныя тэксты набажэнстваў у польскай мове. Гэта знача, што набажэнства ў праваслаўных цэрквах у Польскай Рэчыпаспалітай, а знача і для беларускага праваслаўнага насельніцтва, можа адбывацца замест у мове царкоўна-славянскай, у мове польскай. Ёсьць погаласкі, што гэткія ў польскай мове праваслаўныя набажэнствы маюць ужо пачацца ў найбліжэйшым часе. Сярод беларускага і украінскага праваслаўнага насельніцтва, для якога Праваслаўе ёсьць верай іх бацькоў і аднэй з асноў іх уласнай культуры, гэтыя пачынаньні праваслаўных ерархаў выклікалі зразумелы перапалох і абурэньне.

Гэтыя сапраўды дзіўныя пачынаньні ў царкоўным жыцьці ў Польскай Рэчыпаспалітай ёсьць пладом ня толькі самых праваслаўных ерархаў. Як вуча нас гісторыя, Польшч у сваіх граніцах заўсёды мела нямала праваслаўнага беларускага і украінскага насельніцтва і заўсёды з разьвязаньнем праваслаўнай праблемы мела многа хлопату. Польская дзяржаўная палітыка даўней, выпрабаваўшы розныя спосабы разьвязкі праваслаўнай праблемы, урэшце знайшла яе аж у самым канцы XVIII ст., прад самым падзелам Польшчы, калі была створана аўтокефальная царква, якую пацьвердзіў Праваслаўны Зьезд у Пінску ў 1791 г. Але прыпомнім хоць збольшага вытокі гэтай справы і як Польшч да гэтага дайшла.

Ад самага пачатку Праваслаўя на беларускіх і украінскіх землях, у Вялікім Княстве Літоўскім, а так-жа і на тых землях, якія беспасрэдна належылі да Польшчы, Праваслаўе агулам кіравалася сваімі царкоўнымі законамі і залежала ад Кастантынапольскага Патрыярха. Як улады Вялік. Княства Літ., так і Польшчы з гэтым мелі заўсёды шмат бяды, але неяк справу наладжвалі. Было гэтак аднак да часу, да часу, покуль не акрэпла Масква і покуль не арганізавалася ў сільнае гаспадарства, якое павяло імпэр'ялістычную палітыку «собиранія русскихъ земель». Асабліва гэнае «собираніе», ці прасьцей кажучы, заваёўваньне беларускіх і украінскіх зямель Масквой набрала вялікай сілы, калі ў 1589 г. быў створаны ў Маскве царкоўны Патрыярхат. Факт гэты меў вялікае значэньне, ён даў магчымасьць гэтыя землі прыгортваць да Масквы ўжо ня толькі палітычна, але так-жа і культурна. Служыла гэтаму як ня трэба лепш Маскоўская Царква, у залежнасьці ад якой апынулася Праваслаўная Царква на беларускіх і украінскіх землях, якія на Люблінскай Уніі 1569 г. фактычна згубілі сваю палітычную самастойнасьць і былі далучаны да Польшчы, як звычайныя складовыя яе часткі.

Вось-жа прад Польшчай стала цяжкое пытаньне, як разьвязаць праваслаўную праблему ў нутры свайго гаспадарства, каб праваслаўныя свае народы ў іх рэлігійным жыцьці адгарадзіць ад маскоўскай залежнасьці. Некаторыя польскія палітыкі дараджалі ўраду стварыць і ў Польшчы Патрыярхат, які-б кіраваў Праваслаўнай Царквой у Польшчы незалежна і ад Масквы і ад Патрыярхату Кастантынапольскага, другія-ж узноў палітыкі дараджалі Унію з Рымам. Як ведаем, перамаглі гэтыя другія палітыкі. У 1596 г. паўстала ведамая царкоўная Унія ў Берасьці, праз якую польскія палітыкі думалі ня толькі адгарадзіцца ад Масквы, злучаючы праваслаўных Польшчы з Рымам, але думалі так-жа цалком апалячыць гэтых праваслаўных, паволі пераводзячы іх на лацінскі абрад і на польскую мову.

Пляны гэтыя аднак не апраўдаліся. Унія Праваслаўя ня зьнішчыла. Наадварот — яго адрадзіла і загартавала. Праваслаўе барацьбу выдзержыла, не парвала зносінаў з Масквой і, карыстаючыся паддзержкай асабліва пара Пятра I і царыцы Кацярыны II, у вялікай меры прычынілася да ўпадку Польшчы, да яе падзелу.

У 1791 г., як мы ўжо ўспомнілі, прад самым сваім аканчальным падзелам, Польшч прабавала яшчэ аднаго спосабу разьвязкі праваслаўнай праблемы — яна мінаючы Маскву, дабілася ад Кастантынапольскага Патрыярха прызнаньня аўтокефаліі Праваслаўнай Царквы ў Польшчы, гэта як-бы яе самастойнасьці, незалежнасьці ад нікога паза самай Польшчай. Што аднак з гэтага выйшла-б у практыцы, сказаць трудна. Гісторыя на рэалізацыю гэтай праваслаўнай польскай палітыкі не чакала. За пару гадоў пасьля ўвядзеньня ў Польшчы гэтай аўтокефаліі, Польшч як палітычны незалежны быт існаваць перастала.

Адроджаная сучасная Польшч, у нутры якой узноў апынуліся цэлыя тэрыторыі з беларускім і украінскім праваслаўным насельніцтвам, прыступаючы да разьвязкі праваслаўнай праблемы, узноў зачапілася за традыцыю гэнага Пінскага Праваслаўнага Зьезду, які прызнаў аўтокефалію Праваслаўнай Царквы ў Польшчы ў 1791 г. Вось-жа цяпер у Польшчы існуе аўтокефальная Праваслаўная Царква, як сказана вышэй, і станавіцца на шлях тварэньня Польскага Праваслаўя, што ёсьць зьявішчам ужо сусім новым, у мінуўшчыне якое ня мае ніякай традыцыі.

Праўда, цяпер польская праваслаўная палітыка не напатыкае такіх труднасьцяў, як даўней. Даўней у рэлігійнае жыцьцё праваслаўных беларусаў і украінцаў у Польшчы ўмешвалася аднаверная Масква. Сучасная-ж Масква, як цэнтр дзяржавы атэістычнай, атэізм якой зьяўляецца як-бы свайго роду рэлігіяй, такой ці іншай польскай праваслаўнай палітыкай не праймаецца і Польшч у гэтай справе мае сусім вольную руку.

Ня гледзячы аднак на гэта, мы ня верым, каб спробы стварэньня польскага праваслаўя далі якія пазытыўныя вынікі. Нам здаецца, што вышэйшае праваслаўнае духавенства, якое сяньня ёсьць сусім чужое беларускаму і украінскаму народу, і якое ідзе на тварэньне польскага праваслаўя коштам культуры гэтых народаў, можа спольшчыцца, але народ яго плянаў ня прыме ніколі. Праўда, народ сяньня бадай што ня здоляе актыўна процiўставіцца польскай мове ў яго адвечнай царкоўна-славянскай літургіі, але затое ён сяньня мае іншы спосаб барацьбы з гэтым — ён пакіне цалком царкву і пакіруецца ў бок атэізму. Ужо на гэта сяньня шмат і дужа шмат ёсьць доказаў. І выходзе — ня кіем, дык палкай: праваслаўная ерархія сваей гэткай дзіўнай палітыкай зблізіае праваслаўных беларусаў і украінцаў да атэістычнай Масквы, а далейшыя высновы гэтага ідэова-палітычнага збліжэньня кожнаму ясныя.

Да таго-ж ня трэба так-жа забывацца, што прымусовы атэізм у Маскве некалі міне, наступе вольнасьць рэлігіі, а з гэтым прыйдзе і арганізацыя Праваслаўнай Царквы. Ужо газэты пішуць, што быццам савецкія палітыкі думаюць дазволіць стварыць у Маскве Патрыярхат. А з гэтага высновы так-жа былі-б ясныя.

З усяго вышэй сказанага мы даходзім да гэткага вось вываду: срога кананічнае жыцьцё Царквы, у шчыльнай лучнасьці з праваслаўным народам — беларускім і украінскім, шырокае карыстаньне беларускай і украінскай мовай у дадаткавым набажэнстве і ў казаньнях, ня рухаючы царкоўна-славянскай мовы ў самай літургіі, распрацоўваньне ідэі беларуска-украінскай — на беларуска-украінскіх землях — царкоўнай аўтокефаліі, так-жа срога кананічна і згодна з прыроднымі правамі беларусаў і украінцаў — вось адзіныя, на нашу думку, спосабы разьвязкі праваслаўнай праблемы на беларуска-украінскіх землях Рэчыпаспалітай Польскай.

Demokratyzm i nacyjanalnaja sprawa

Na pačatku nowaha demokratyčnaha ruchu, jaki pačaŭsia ŭ 18 stahodździ, salidarna zmahalisia procjŭ dyktatury šlachockaha stanu ŭsie abiaspraŭnienyja klasy: miaščanstwa, sialanstwa, a nawat i kapitalistyčnaja buržuazija jšła spačatku z narodam procjŭ šlachty i wyjaŭlała sympatyju da demokratyčnych idejaŭ. Ale hetak było pakul nie pieramahli dyktatury šlachockaha stanu i nie zawiali asabistaj swabody dla kožnaha hramadzianina dziaržawy. Kali-ž heta asiahnuli — kapitalistyčnaja buržuazija ad demokracyi adchinułasia, bo dla jaje ŭžo było dawoli taho, što jana zdabyła roŭnaje prawa z šlachtaj. Fabrykanty, bankiry, kupcy i abšarniki pačali bajacca dalejšaha pašyreńnia demokracyi, bo tady jany musili-b adracčysia ad swaich prywilejaŭ i karystańnia wialikimi bahaćciami pradukcyi i hrašowaha kapitału. Dziela hetaha buržuazija ad paławiny 19 stahodździa pačała abjednywacca z šlachtaj, kab supolna ŭstrymać dalejšy postup demokratyzmu. Hetkim šlacham buržuazija dajšła da parazumieńnia z šlachtaj. Ad taho času jak šlachcie, taksama i buržuazii zaležała na tym, kab nie dapuścić da pašyreńnia demokracyi. Takim čynam buržuazija razam z šlachtaj stanuła suproć pracujučych masaŭ i pracujučaj intelihiencyi, jakija stajali za dalejšaje pašyreńnie demokracyi.

Pakul nia było demokratyčnaj dumki, datul byŭ ŭusim inšy i nie padobny da ciapierašniaha pahlad na sprawy nacyjanalnyja. Tady narodam uważała siabie tolki taja častka narodu, jakaja mieła ŭ rukach dziaržaŭnuju ŭładu. Heta byli: šlachta, buržuazija i kler. Tolki jany tady stanawili narod — nacyju; sialan i miaščan jany za narod-nacyju nie ŭważali. Wialikuju sialanskuju masu šlachta nie ŭważała nawat za ludziej, a prosta za swoj inwentar, prypisany da panskaj ziamli. Nacyjanalnaj sprawaj ŭważała tady šlachta tolki swaju asabistuju sprawu. Dziela swajej asabistaj sprawy wyrakałasia šlachta rodnaj mowy, wiery swaich baćkoŭ, adrakałasia ad swajho nacyjanalnaha imiani, pryłučałasia da inšaj „nacyi," wyraźniej, da taje šlachty, jakaja mieła bolšuju siłu. Wiedama, što kali jakaja kraina papadała pad uładu inšaj šlachty, dyk naŭpierad pierachodziła da pracŭnika šlachta. Za prykładam daloka chadzić nia treba — biełaruskaja šlachta pierajšła ŭsia da Palakoŭ i Rasiejcaŭ. Isnawańnie biełaruskaj nacyi, heta naśledki taho faktu, što biełaruskaje sialanstwa nie pajšło za swajoj šlachtaj i nie paddałosia ani palanizacyi, ani rusyfikacyi.

Demokratyčnaja ideja razbudziła da žyćcia tak-ža i paniawolenyja narody, u hetym liku i Biełaruski narod. Demokracyja abwieściła prawa roŭnaści ŭsich ludziej. Na padstawie hetaha prawa narod — nacyju stanowiać nia tolki šlachta, ale tak-ža i sialanie i rabotniki i ŭsie inšyja klasy. Demokracyja adkinuła pahlad, što jość niejkija „lepšyja" abo „wyšejšyja" rasy i narody, losam praznačanyja da panawańnia nad druhimi narodami. Takim čynam demokracyja budziła paniawolenyja narody da žyćcia i dawała im moralnaje aružža dziela baraćby z hnybicielami. Woś-ža ŭsie paniawolenyja narody za swajo nacyjanalnaje adradžeńnie ŭdzialničajuć u pašyreńniu demokratyčnaj idei. Kali-b wykinuć demokratyčnuju ideju z žyćcia paniawolenaha narodu, tady nia budzie nijakaj idejnaj asnowy dziela baraćby za nacyjanalnaje wyzwaleńnie. Tady astaŭsia-b tolki prykaz „hołaj siły," jakaja prahawarwaje rasłucca na karyść panujučaj nacyi, bo-ž jana ŭžo dakazała faktam, što „silniejšaja," a dziela hetaha jaje prykaz źjaŭlajecca prawam.

Heta wielmi dobra razumieli ŭsie biełaruskija budzicieli i dziela hetaha jany byli demokratami. Razumiejuć heta dobra i ciapierašnija pawadyry biełaruskaha adradženskaha ruchu, abjednanyja pad ściaham „Biełaruskaha Narodnaha Abjednańnia" (BNA), stawiačy miž inšym u swajej prahramie hetkija demokratyčnyja postulaty:

BNA imkniecca da taho, kab u niezaležnaj Biełarusi byŭ stworany taki hramadzki ład, jaki, apirajučysia na pracy, hramadzkaj roŭnaści i sprawiadliwaści, nie dapuskajučy da ekspioatacyi adnych druhimi, zaspakojwaŭ-by palityčna-hramadzkija, kulturnyja i ekanamičnyja patreby hramadzian;

BNA procjŭ usiakaj dyktatury, jakaja z saboj niasie paniawoleńnie narodaŭ i pracujučych masaŭ;

BNA za roŭnyja prawy dla ŭsich hramadzian;

BNA za swabodu isnawańnia relihii i dziejnaści relihijnych ustanoŭ i za swabodu wyznawańnia relihii;

BNA damahajecca poŭnaj swabody wybaraŭ u dziaržaŭnyja i samaŭradawyja ŭstanowy na padstawie ahulnaha, prostaha, tajnaha, roŭnaha i praparcyjanalnaha hałasawańnia;

BNA za toje, kab kožnaja nacyjanalnaść mieła prawa karystacca swajej mowaj ŭ ahulna-hramadzkim i palityčnym žyćci;

BNA ličyć swaim idealam, kab Biełaruski narod mieŭ dobryja adnosiny z usimi narodami na padstawie ŭzajemnaści, roŭnaści i mižnarodnaj sprawiadliwaści i h. d.

Demokracyja nia tolki ŭzbudziła Biełarusaŭ da adradžeńnia, ale jana daje i nutranuju aktyŭnaść. Demokracyja zaklikaje da hramadzkaha žyćcia kožnuju adzinku, biaz roźnicy pachodžańnia i prakanańnia, abwiaščajučy ŭsich roŭnymi bratami ŭ narodnaj siamji, abawiazanymi da supolnaj pracy dla dabra narodu. Hetkim čynam demokracyja ŭzbudžaje pačućcio jednaści i wyklikaje aktyŭnaść.

Usie procjŭdemokratyčnyja kirunki padtrymliwajuć u narodzie pasyŭnaść, bo jany šukajuć apiryšča abo ŭ pawadyroch, abo ŭ silniejšych za siabie. Dla paniawolenaha narodu hetkija prajawy wielmi škodnyja.

Demokracyja ŭskładaje adkaznaść za dolu narodu na ŭsich hramadzian, a suproćdemokratyčnyja kirunki asłablajuć hetkaje zbolšanaje pačućcio adkaznaści za dolu narodu, bo adbirajuć hetaje ważnaje pačućcio narodnym masam. U kancy treba adznačyć i toje, što demokracyja daje narodu pačućcio *poŭnawartaści i roŭnapraŭnaści* z kožnym i najsilniejšym narodam świetu. Bo hetaje pačućcio wyplywaje z demokratyčnaj zasady, što ŭsie narody i ŭsie ludzi jość roŭnyja i wolnyja, a nieroŭnaść, paniawoleńnie i ŭcisk jość niemoralnyja i dziela hetaha z imi treba zmahacca.

Treba tak-ža adznačyć, što demokratyčnaja ideja źmiaščaje ŭ sabie ideju prawa, roŭnaha dla ŭsich narodaŭ. Wiedama, što ideju *samaaznačeńnia narodaŭ* abwieściła demokracyja.

Z wyšejskazanaha jasna, što nacyjanalny ruch niedziaržaŭnych narodaŭ musić być tolki demokratyčny. Hetkim musić być i biełaruski adradženski ruch.

p - k.

U Litoŭcaŭ

Adozwa da narodu. 28.X sioleta litoŭskaje prašwietnaje T-wa „Rytas" u Wilni wydała adozwu da litoŭskaha narodu ŭ Polščy, zaklikajučy jaho šanawać swaju mowu, harnucca da rodnaj aświety, staracca swajej školy, a tak-ža zaŭsiody palitoŭsku hawaryć i palitoŭsku wučycca prywatna. Adozwa heta źmieščana ŭ Nr. 88 „Viln. Rytojus".

„Rabota wyradkaŭ". U Nr. 89 „Viln. Ryt." pad hetkim nazowam spatykajem ustupny artykuł, u jakim padčyrknuta sumnaja źjawa častaha pieraškadžańnia litoŭcam z boku biełarusaŭ u ich karystańni litoŭskaj mowy ŭ kaściele. Aŭtar henaha artykułu dachodzić da wywadu, što heta jość rabota wyradkaŭ, jakija zabylisia, chto jany i dziela swajej niaświedamaści ab swaim pachodžańni litoŭskim ci biełaruskim, pamahajuć palakom. Ad siabie možam tut dadać, što z hetaj sapraŭdy sumnaj prajawaj u litoŭskabiełaruskim žyćci treba rašuča i wytrywała barocca i što najlepšym sposabam hetaj baraćby jość adpawiednaja hazeta j knižka, jak biełaruskaja, tak i litoŭskaja.

Wysieleny Ks. N. Raštutis. Sioleta ŭ sakawiku miesiacy siabra Centralnaj Upprawy T-wa św. Kazimiera Ks. N. Raštutis atrymaŭ ad wilenskaha wajawody L. Bacianskaha zahad praz niekalki dzion wyjechać z hranic Polskaj dziaržawy. Ks. Raštutis adrazu pačaŭ rabić staraŭni, kab jaho wysialeńnie było ŭstrymana. Jon pasłaŭ u Waršawu apelacyjnuju skarhu, a sam pajechaŭ u Zakapanaje lačycca. Što ŭ hetaj sprawie rašyła Waršawa, — niawiedama. Wiedama tolki toje, što Ks. N. R. u Zakapanym byŭ aryštawany i 2.XI prywiezieny ŭ Wilniu, a 6.XI wysieleny za polska-litoŭskuju hranicu.

Spyniajuć i začyniajuć. „Viln. Ryt." u Nr. 89 piša, što cełу rad adździełaŭ Lit. Ziemlarobskaha T-wa polskija ŭłady spynili i zakryli.

Pakarali za hurtki maładych haspadaroŭ. Apirajučysia na statucie Lit. Zieml. T-wa ŭ niekatorych miascoch pry addziełach T-wa byli arhanizawany tak zwanyja hurtki maładych haspadaroŭ. U hetyja hurtki byli pryjmanyja z wiedama baćkoŭ 14—18 hadoŭ chłopcy i dziaŭčaty. Apošnim časam administracyjnyja ŭłady na hetyja hurtki pačali hladzieć jak na susim asobnyja nielehalnyja arhanizacyi i karać za ich isnawańnie. Za heta pakarali cełу rad asob. Usie pakaranyja swaju sprawu padali ŭ sud.

Dopyty ksiandzoŭ. Nia tak daŭno 11 litoŭskich ksiandzoŭ u Świancianskim paw. atrymali aficyjalnyje pawiedamleńnie, što procjŭ ich padniata sudowaja sprawa za litoŭščańnie praźwiščaŭ. Woś-ža 30.X usie hetyja ksiandzy byli paklikany ŭ Świanciany, dzie śledawaciel-suždzija ŭsich ich u hetaj sprawie dapytywaŭ.

У Т-ве Прыяцеляў Беларусаведы пры У. С. Б.

15 XI у VI залі галоўнага унівэрсытэцкага будынку адбудзецца чарговая зборка Таварыства з рэфэратам др. Я. Станкевіча на тэму: — „Новае асьвятленне некаторых мамэнтаў з гісторыі Рэчыпаспалітай. Пачатак у 17 гадз. Уваход вольны.

Др. Ст. Грынкевіч. 8)

У братоў украінцаў.

МІТРАПАЛІТ ШАПТЫЦКІ.

Чым Папа ў Рыме, тым Мітрапаліт Шаптыцкі ў Львове. Не пабачыць Яго, значыцца ня мець цэлага Львова. Волат у дасло̆ўным сэнсе слова і волат духа — трывае здаецца бяззьменна на сваём становішчы за памяці двох пакаленьняў. Жывая традыцыя далёкіх стагодзьдзяў, патомак слаўнага роду, стануў у рады змагароў за новую пару Украіны і зьяўляецца сымбалем слаўнае мінуўшчыны і сьветазарнае будучыні. „Няма другога чалавека ў украінскім сьвеце, як Мітрапаліт. Няма паміж украінскім грамадзянствам больш заслуганай адзінкі, як Ён. Няма паміж усей украінскай зямлі другога павадыра з гэткім маральным аўторытэтам..." („з нагоды юбілею Мітрапаліта") часапіс „Жінка."

Старое знаёмства нас беларусаў з Мітрапалітам. У далёкім Львове Ён умеў зглядзіць першыя спробы нашага Адраджэньня і сам аўторытэтам, радаю, помаччу падтрымліваў кожны наш пачын, Ён умеў чуткаю душою зразумець нашыя злыбеды, умеў падтрымаць веру ў перамогу. Гісторыкі калісь усебакова ацэняць Ягоную ролю і ўсходнія пляны на асноведзі карэспандэнцыі і гутарак з дзеячамі беларускімі.

Што-ж тады казаць аб Ім у адносінах да украінскага адраджэньня?! Ад мамэнту, калі будучы 34 гадовым маладым чалавекам, заняў Ён у 1899 г. эпіскапскі пасад у Станіслававе і далей праз некалькі гадоў стаўшы Мітрапалітам Галіччыны, ня было і няма ніводнае працы, дзе-б ня бачылі-б мы Ягонага прозьвішча. Ён у 1899 г. заклікае ў сваіх „Пасланіях" сьвяшчэньнікаў да працы ў „Просвіце" на карысьць царквы і народу, Ён дае грошы на выдавецтвы. За Яго пачынам паяўляецца бурса для украінскае моладзі. Ад Яго выходзіць ініцыятыва заснаваць першую Украінскую жаночую гімназію. Прыпынак для хворых студэнтаў і санаторыя з Ягонае ахвяры. Сірацінец для дзяцей, што асталіся без бацькоў, дом для парадніц мацяркам, летнія аселішчы для гарадзкіх дзяцей — новыя сьледамкі грамадзкасьці іахвярнасьці Мітрапаліта. «Народня Лічныця» пачынае працу дзякуючы таму, што знайшла ў Мітрапаліце чалавека з шырокім сэрцам і рукою. Без Яго не пабачыў-бы сьвету „Шпіталь Народнае Лічныці", пазорная будыніна якая адчыніла ўжо часткова дзьверы ўсім хворым. Некалькі апошніх дзесяткоў гадоў украінскае працы ў кожнай дзеялнцы — асьветнай, гаспадарчай, літаратурнай, мастацкай стульна злучаны з Андрэям Шаптыцкім. Ён цэлая эпоха ў грэцка-каталіцкай царкве. Можна вельмі сумлявацца, чым сяньня была-б царква ня маючы такога Мітрапаліта. І думаю, з жахам прагаляю ад сябе назольлівую думку змагары за незалежнасьць царкоўнага жыцьця аб тым, што будзе, калі на стане Андрэя!

Ідзем на сьв. Юрскую гару, што вялічаецца над Львовам. Перад Палацам маладыя сьвяшчэньнікі, стаяць безнадзейна. На дзьверох картачка—Мітрапаліт не прыймае. Што рабіць?! Пішам картачку да мітрапалітавага капэляна, што, маючы вельмі абмяжованы час, хацелі-б мець гонар аддаць паклон Мітрапаліту. Праз пару мінут дасталі адказ, што калі толькі зможа, дык нас прыйме. Заўсёды заняты, заўсёды поўна ў Яго гасьцей з далёкага сьвету, поўна сваіх людзей. Заўтра паседжаньне капітулы, сяньня візыта нейкіх галяндзкіх і бэльгійскіх пралатаў ці манахаў.

Жджэм у вялікай залі, на сьценах партрэты колішніх уладыкаў і мітрапалітаў грэцка-каталіцкіх. Збе калісь пэмнія імі будзе найлепшае месца Андрэю Шаптыцкаму, які настолькі вышэй за шмат каго з гэных ужо даўно адыйшоўшых людзей?!

Выходзіць апошні сьвяшчэньнік. Мая пара. Стукаю ў дзьверы і ўвайшоўшы у вялізарны габінэт, шукаю гаспадара. Налева, за сталом, над кніжкаю, кідаецца галава, нязвычайна мастацкі твор натуры, якога ня можа перадаць ніводзін разьбяр, ніводзін маляр. Колькі ў Ягонай асобе велічы, магутнасьці, розуму і аднача дабраты, ветласьці. Мітрапаліт шмат ужо гадоў не падыймаецца на ногі, ляжыць спаралізаваны, аднак стоючы пры Ем чалавек забываецца, што гэта чалавек як усе іншыя людзі, якога нядужасьць прыкавала да ложка і крэсла.

Якая памяць, колькі жывасьці, колькі зацікаўленьня аб нашых беларускіх справах! Які шырокі пагляд на ўсе пытаньні нацыянальнарэлігійнага жыцьця! Кажа, што жывое перамога ўсё на сваім шляху, што ніякія запыні, адкуль яны і якія людзі іх не раблі, усё прападзе перад праўдаю, шлях да перамогі ня лёгкі, на ём трэба ня толькі часу, працы, але ахвярнасьці, крыві і жыцьця...

Баюся даўжэй забіраць час Дастойнаму Гаспадару. Заклікае Ён, каб прыйсьці на другі дзень, меціме свабодную часіну — дык ахвотна яшчэ пагаворыць з сынам далёкага Беларускага народу...

Выходжу, за мною ўжо сьвят. Юрская гара, а яшчэ поўныя вочы гэнага Вялікага Сына Украіны.

ПРЭСА.

Пачынаючы ад другое палавіны XIX стагодзьдзя можна было-б назваць мінуўшую пару — ўключна нашыя дні — „парою прэсы." Пачаткі прэсы шмат ранейшыя. Ня сыграла яна аднак раней большай ролі дзеля малога кругу чытачоў, на якіх мала дзеяць. Сяньня

Japonija ŭ Kitai i sprawy Anhlii, Ameryki i SSSR

Japonija, imknučysia da ekanamičnaha zaŭładańnia Kitajem, starajecca śpiarša stwaryć „aŭtanomiju“ dla piaci paŭnočnych kitajskich prawincyjaŭ, jakija tady byli-b adkrytyja dla japonskaj ekspansii. Apracá hetaha Japonija imkniecca dabicca ad Kitaju specyjalnych palohkaŭ na ŭwoz japonskich tawaraŭ; starajecca dabicca, kab Kitaj zaklučyŭ z Japonijaj palityčny sajuz suproć SSSR.

Pakulšto Kitaj ani na adno z hetych japonskich damahańniaŭ nie zhadžajecca. Kitaj staić na swaim hetkim stanowiščy wielmi ŭporysta, spadziajučysia na padtrymańnie inšych dziaržaŭ. Adnačasna ŭ Kitajščynie razrastajucca prociŭjaponskija nastroi. Dziela hetaha spadziajucca, što wajna Japonii z Kitajem nia minučaja.

Suproć japonskich planaŭ u Kitajščynie stajać: Anhlija, Zł. Št. Ameryki i SSSR. Dziela hetaha Japonija prawodzić tam swaje plany wielmi aściarožna.

Polskija sprawy

Świata niezaležnaści i pajezdka min. Beka ŭ Londan.

Z hodu ŭ hod usia Polšč 11 listapada abchodzić uračysta ŭhodki dziaržaŭnaj niezaležnaści.

Sioletnija ŭhodki niezaležnaści adbylisia niazwyčajna ŭračysta. Świata pačałosia 10 listapada i zakončana poznym wiečaram 11 listapada.

Sioletniaja ŭračystaść adznačajecca faktam nadańnia kamandzieru polskaj zbrojnaj siły najwyšejšaha wajskowaha čynu — maršała. Takim čynam kamandzier polskaj zbrojnaj siły Adward Rydz-Śmihły staŭsia maršałam Polščy.

Pryhetym treba adciemić, što maršał Rydz-Śmihły adnačasna atrymaŭ ad cara Japonii ordar „Uschodziačaha Sonca“.

Padčas hetaj uračystaści ŭ Polščy ministar zahraničnych spraŭ Bek prabywaŭ u Londanie i tam wioŭ pierahawory ŭ sprawach mižnarodnaj palityki z anhielskimi dyplomatami. Hazety padajuć, što hetyja hutarki adbywalisia ŭ płoščy spraŭ zabiaśpiečańnia miru na ŭschodzie Eŭropy i mahčymaści emihracyi z Polščy.

Roznyja wiestki

Z HAZET.

Nie rabi taho druhomu, čaho nia chočaš, kab tabie było zroblena. Dziŭnaja etyka niekatorych polskich hazet. Abšarnickaje „Słowo“, što wychodzić u Wilni, da sprawy biełaruskaj u Polščy stanowicca prosta — Biełarusaŭ asymilawać. Druhaja polskaja hazeta — „Kur. Wileński“, u biełaruskaj sprawie tak-ža radzić tasawać asymilacyju Biełarusaŭ i swaju radu matywuje niejkim „prawam“, jakoje źjaŭlajecca ŭ razumieńni pryrodnaha prawa hrubym hwałtam.

Pawodle „Kur. Wil.“ nacyjanalna niaświedamyja biełarusy heta niebiełarusy i ich možna apalačywać. Taho, što hetyja, pawodle „Kur. Wil.“ „niebiełarusy“ haworać pabiełarusku, majuć biełaruskija zwyčai i ničym nia rožniacca ad świedamych biełarusaŭ, chiba tolki tym, što ciamniejšyja i ahułam mienš kulturnyja adzinki za tych, što ŭ ahulnym raźwićci stajać wyšej, „Kurjer Wileński“ pad uwahu nie biare. Dla „Kur. Wil.“ ciamniejšyja biełaruskija masy heta matarjał dziela pierarobki na palakoŭ.

U hetaj sprawie z nacyjanalistymi „Kur. Wilenskaha“ i „Słowa“ ŭ XX stahodździ na ŭschodzie sučasnaje polskaje dziaržawy palemizawać niemahčyma. Jany zdolnyja zrazumieć jaje tolki ŭ eposie XIX stahodździa i tolki na zachadzie sučasnaje polskaje dziaržawy.

Woźmiem u prykład Kašubaŭ, jakija biassumleŭna jość palakami, katoryja tak-ža ŭ swajej masie majuć niamała niaświedamych swajej nacyjanalnaj asobnaści, asabliwa mieli ich u časy tam niamieckaha panawańnia. Pawodle wywadaŭ „Kur. Wil.“ adnosna biełarusaŭ, niemcy zusim zakonna, biez narušeńnia pryrodnaha prawa denacyjanalizawali polskich kašubaŭ. Tymčasam ni adzin dobry palak i ni adzin česny čaławiek nie pryznawaŭ i nie pryznaje niamieckaj „hakaty“ sprawaj zakonnaj, bo heta byŭ hwałt suproć pryrodnaha prawa, tasawany niemcami adnosna palakoŭ.

Na paniaćcie „Kur. Wil.“ **prawa** musim źwiarnuć uwahu, što jano (prawa) nia tak pradstaŭlajecca i jaho treba razumieć inakš.

Luboŭ baćkaŭščyny i narodu padlahaje **prawu**. Luboŭ baćkaŭščyny i narodu jość wialikaj i wysokaj cnotaj, jakaja zaklikaje da charošych ludzkich čynaŭ, ale nadmiernaja luboŭ swajho narodu stanowicca žarałom kryŭdy i prastupku, a kryŭda i prastupak, heta wypład pahwałčańnia prawa.

Endecki padskok. U Niepokalanowie, kala Waršawy, u drukarni aa. Franciškanaŭ drukujecca endeckaja hazecina „Mały Dziennik“, jakaja rassyłajecca i ŭwa ŭsie katalickija parafii našaha Kraju. Hety endecka-klerykalny časapis nijak nia moža ściamić, što Biełarusy ŭ polskaj dziaržawie žywuć nia z łaski, a na padstawach prawa pryrodnaha i asnaŭnoha Rplitaj. Nia wiedajuć jany i taho, što biełarusy žywuć i na Paleśsi.

Hetyja pany ajcy duchoŭnyja na suproć abawiazwajučaj i ich chryścijanskaj lubowi i abawiazwajučaha prawa pryrodnaha i ahulna-dziaržaŭnaha, nakazwajuć Biełarusam, kab jany swoj byt u polskaj dziaržawie ŭwažali aktam łaski.

Nu, ale hetaha pawažna brać pad uwahu nia treba, bo heta ništo inšaje, jak ačadzieły ad nacyjanalizmu čarhowy endecki padskok.

Dwa prysudy na śmierć. U Bereżanach, u Haliččynie nadowiačy zakončyŭsia palityčny sudowy praces, jaki pradaŭžaŭsia praz 23 dni; sudzili 19 maładych sialan za prynaležnaść da OUN (Orhanizacyja Ukrainskich Nacyjanalistaŭ, nielehalnaja) i za zabojstwa M. Tutki. Akružny sud z učaściem prysiažnych zasiedacielaŭ padsudnych zasudziŭ: Iwana Lubamirskaha i Andreja Zasiedko na karu śmierci, zamianiajučy na padstawie amnestyi karu śmierci na daśmiertny astroh; rešta zasudžany ad 1 da 12 hadoŭ astrohu.

Z POLŠČY

Ačystka pola. Ministerstwa Nutranych Spraŭ wydała rasparadžeńnie, jakim nakazwaje ŭsim wałasnym radam, kab zarhanizawali nadzor ačystki kamianistaha pola. Kamieńni treba składać u kučy kala daroh i na miežach.

Hetaje rasparadžeńnie pradbačyć naładžańnie konkursaŭ z premijami dla tych ziemlaŭłaśnikaŭ, katoryja lepš za druhich ačyściać swajo pole.

Aryšty kamunistaŭ u Waršawie. Hazety padajuć, što ŭ Waršawie palicyja wykryła wialikuju tajnuju kamunistyčnuju arhanizacyju; kamunistyčnaja arhanizacyja hatowiłasia da manifestacyi 7 listapada, u hadaŭščynu paŭstańnia sawieckaj ułady. Aryštawana kala sta čaławiek.

Z ZAHRANICY

Z frontu bratabojčaj wajny ŭ Hišpanii. Apošnimi časami hišpanskija fašysty zrabili wialiki aružny postup i ŭžo ŭwajšli ŭ hišpanskuju stalicu Madryd. U Madrydzie jość tak-ža i wojska respublikanskaje. Takim čynam Madryd apynuŭsia terenam bratabojčaj wajny; na wulicach swajej stalicy paŭstancy zrabili front chatniaj wajny z respublikanskim wojskam i hetak zabiwajučy brat brata niščać tak-ža i histaryčnyja mastackaj wartaści budyniny.

Respublikanski ŭrad užo wyjechaŭ z Madrydu.

Nowy parlamant Zł. Št. Ameryki. Ab wybarach na prezydenta Zł. Št. Ameryki Roosevelta my ŭžo pisali.

Razam z wybarami prezydenta tam . adbywajucca i wybary ŭ parlamant Woś-ža nowy parlamant Zł. Št. Ame-yki pradstaŭlajecca hetak: u pałacie pasłoŭ jość 334 demokrataŭ, 89 respublikancaŭ, 7 pastupoŭcaŭ i 5 farmeraŭ; u senacie 75 demokrataŭ, 17 respublikancaŭ, 2 farmeraŭ, 1 pastupowiec i 1 niezaležny.

Z hetaha bačym, što Zł. Št. Ameryki demokratyčnyja.

Kamintern u Paryžy. Hazety padajuć, što francuskija kamunisty razwažajuć nad tym, kab pieranieści Kamintern z Maskwy ŭ Paryž.

Tyja-ž hazety pišuć, što maskoŭskija kamunisty, na čale z Stalinam, ničoha prociŭ pieranosu Kaminternu nia majuć, a nawat na heta achwotna zhadžajucca.

„Відродження“

Пад гэткім назовам IX-ты год выходзіць украінскі месячны часапіс, які на сваіх бачынах пашырае ідэю барацьбы з алькаголем і з нікатынай. Часапіс рэдагуецца дужа добра і зьмяшчае шмат цэннага матар'ялу на тэмы цьвярозасьці. Разумеючы патрэбу барацьбы з гарэлкай і з тытуном сярод беларускага народу, горача радзім Беларусам, якія праводзяць ідэю цьвярозасьці, выпісваць часапіс „Відродження“ і карыстаць з яго.

Часапіс гэты каштуе на год 4 залатоўкі. Грошы можна слаць на паштовае конто № 154.586. Адрас: Lwów, Чарнецького 26, рэд. „Відродження“.

З тэй-жа рэдакцыі „Відродження“ можна выпісаць наступныя кніжкі:

1. На Роздоріжжі або за і проти алькоголю — Ю. Каменецького 0,80
2. Алькоголізм і народнае господарство 0,40
3. Кишеневий Календарик „Відродження“ на 1937 г. 0,10

толькі глухія старонкі ня цікавяцца прэсаю, па ўсіх культурных краінах роля ейная настолькі вялікая, што называюць яе „дзяржаваю ў дзяржаве.“ Можна розна заглядацца на ейнае значэньне, ніхто аднак пярэчыць ня будзе, што роля інформацыйная, асьведамляючая, творча-ідэолёгічная, узгадаваўчая і, што само сабою зразумела, роля дэструкцыйная, у залежнасьці ад якасьці і характару прэсы — ёсьць вялізарная.

Пачаткі прэсы ў Галіччыне вельмі далёка за намі. Львоўскае „Діло“ сьвяткаваціме хутка 60-тыя ўгодкі свае працы, а „Діло“ пачало працу на падрыхтаваным грунце. Ужо хутка пасьля цэсарскага маніфэсту ў 1848 і Краёвага Зьезду Русіноў у Львове паяўляецца рэгулярны часапіс „Слово,“ які становіцца пазьней органам толькі групы старарусаў. Народніцкая група, дзеля распаўсюджваньня собскае ідэолёгіі, выдае ад 1868 г. часапіс „Правда.“ Тая самая народніцкая група, якая пазьней афармілася ў „нацыянал-дэмакратычную партыю“, ужо ад 1880 г. мае той штодзеньнік „Діло“. Зразумела, што рост нацыянальнае сьведамасьці выклікае новыя й новыя часапісы. Кожная з палітычных групаў рупілася аб выдавецтве свайго органу. Сяньня ў адным толькі Львове ёсьць некалькінаццаць часапісаў з рознаякім напрамкам. Калі нацыяналістаў з фашыстаўскім характарам (на чале Палієў) назавем правымі, „УНДО“ цэнтрам, а украінскіх радыкалаў — левымі, дык да правае прэсы будзе належаць „Українські Вісты“ — штодзеньнік, „Батківщчына“ „Пэрамога.“ Да цэнтру — „Діло“ (штодзеньнік) і „Неділя.“ Радыкалы выдаюць „Громадськый Голос,“ блізкі па ідэолёгіі да радыкалаў орган моладзі „Камэняры.“ Бязумоўна, што падзел палітычнае прэсы вышэйпададзены вельмі схэматычны, дзеля таго што не абхоплівае ён прэсы концэрну „Українська Прэса,“ некаторыя выданьні якога маюць характар палітычны, затое яны беспартыйныя і цяжка казаць ці яны „левыя“ ці „правыя,“ таму што яны прадусім народніцкія. Ды аканчальна сяньня падзел на правых і левых вельмі перастарэлы, і карыстаюся ім, каб лягчэй было ўявіць агульны характар прэсы. Аб концэрне „украінскай прэсы“ скажу ніжэй крыху больш.

Побач прэсы палітычнае, украінцы маюць жшырока разгорнутае выдавецтва прэсы адумысловае характару *асьветнага* агульнага — „Жыття і Знаньне“, „Рідна Школа,“ *коопэратыўнага* — „Коопэратыўна Рэспублыка“, „Господарсько-коопэрат. часопыс,“ *гаспадарчага* — „Сільськы Господар,“ *літаратурнага* — „Назустріч,“ „Обрыі,“ „Вістнык.“

Ёсьць прэса, прысьвечаная *двецям* — „Дзьвіночок,“ моладзі — „Шлях Молоді,“ ёсьць гумарыстычная — „Комар,“ які „кусае шчо тыжня під нэділю.“ Такі часапіс, як „Жінка“, хаця гэта орган „Саюзу Украінак,“ аднак ён займаецца ня толькі арганізацыйнымі праблемамі, а разглядае і палітычныя пытаньні і ўзгадаваючыя і літаратурна-мастацкія. Раскошны журнал „Мыстэцтво,“ прысьвечаны амаль ня выключна малярству і пластыцы.

Вышэйпададзеныя нормы вельмі недакладна і ня вычарпываюча паказваюць багацьце украінскіх рэгулярных выданьняў. Лекары выдаюць орган „Лікарськый Вістнык,“ ёсьць часапісы прысьвечаныя філёзофіі і багаслоўю, маюць свой орган пчаляры і г. д.

Здаецца лёгка сказаць „Вістнык“... Нам назоў гэны нічога ніе гаворыць, для украінскіх чытачоў за гэнаю назоваю хаваецца ідэолёгія рэдакцыі, цэлые групы людзей, якія маюць сваіх прыхільнікаў і ворагаў. Побач скажам з „Вістныкам,“ будзе іншы часапіс, з іншаю або варожаю ідэолёгіяю. Ідзе часам вострае змаганьне паміж паасобнымі групамі на бачынах зусім непартыйных часапісаў, змаганьне, трэба сказаць, карыснае: яно дае магчымасьць адшліфаваць пагляды, выраўняць лінію ў разуменьні паасобных зьявішчаў у сучаснасьці і мінуўшчыне.

Прэса мае чытачоў. Спрэчкі, якія вядуцца ў варожых органах сустракаюць моцнае рэха ў масах... У гэтым і сіла украінскае прэсы!

Правінцыя, незалежна ад Львова, мае даволі багатую прэсу, якая ня можа ані якасьцю пёраў, ані колькасьцю чытачоў раўняцца з цэнтрам.

У Украінцаў можна наглядаць адно зьявішча вельмі характэрнае ў галіне прэсы, якое нам, Беларусам, на першы пагляд мала зразумелае, паіменна: маюць яны ўжо сваю „чыстую“ прэсу. Кажучы „чыстую,“ не хачу процiўстаўляць нейкай папэцканай ці хуліганска-брукавай. Найважнейшая роля прэсы аб'ектыўна інфармаваць чытачоў аб падзеях дня ці агулам сучаснасьці. Чытач з інформацыяў сам павінен зрабіць вывады. Гэтак тэорыя. Практыка паказвае нешта іншае. Група людзей аб'еднаных супольнаю думкаю праводзіць пагляды ў друку, шукаючы сабе спагаднікаў і прыхільнікаў. Такая партыйная групавая, ідэолёгічная прэса сама перажуе ўсенька замест чытача, „аблягчае“ яму работу. Чытачу не астаецца больш нічога, як толькі прыняць пададзеную страву і пераварываць.

Іншая справа, ці наагул магчымая „чыстая“, прэса, якая ўмела-б астацца абсалютна незалежнаю, а праводзіла-б выключна лінію інформацыйную. Можна баяцца, што не, хаця вялікія асяродзішчы Захадняе Эўропы і асабліва Амэрыкі маюць такую прэсу і вельмі даражаць ею. Не вырашаючы гэнага пытаньня прынцыпова, адцемім толькі, што концэрн „Українська Прэса“ якга прадстаўляе гэны тып „чыстае“ прэсы. Гэнае зьявішча настолькі цікавае, што варта спыніцца над ім у некалькіх словах.

Пісьмы з вёскі

Моладзь дзічэе.

Баранавічы. З дзівам прыглядаюся на жыцьцё нашай вясковай моладзі. З дзівам сьляджу і за мясцовай палітыкай адносна яе. Моладзь-жа нашая па вёсках проста дзічэе: паступкі яе паказваюць на прайву адступаньня ўзад у сэнсе культурнага разьвіцьця. Мяне вельмі дзівіць адно зьявішча — чаму не адкрываюцца ў нашым павеце па вёсках беларускія культурна-асьветныя арганізацыі. Калі яны ня могуць паўставаць самі, дык трэба, каб паветавыя ўлады ўвайшлі ў кантакт з цэнтралямі гэтых арганізацыяў і проста ім памаглі разьвіць сваю дзейнасьць у павеце.

Даволі спадзявацца, што нашая вясковая моладзь прывыкне да польскай арганізацыі і прыйме польскую культуру. Практыка паказала, што беларуская моладзь ад польскай культуры ўцякае і ня маючы сваей, блізкай да душы, беларускай культурна - асьветнай апекі, проста дзічэе.

Каб ня быць голаслоўным, паказваю на адзін з мноства фактаў выпадак у в. Краглёх уночы з 25 на 26 мін. м-ца. Аб гэтым выпадку павінна ведаць і паветавае начальства, бо ўсе іншыя аб ім ведаюць.

Дзеля спыненьня моральнага ўпадку і развіцьця дзікасьці сярод нашай вясковай моладзі, трэба пашырыць дзейнасьць беларускіх культурна-асьветных арганізацыяў. Трэба даць у вёску беларускіх кніжак і газэт; трэба пашырыць беларускія тэатральныя прадстаўленьні, хоры; трэба арганізаваць моладзь у ідэйныя арганізацыі, скіроўваючы яе думку да вышэйшых ідэалаў. Але гэта могуць зрабіць толькі свае, беларускія арганізацыі. Польскія арганізацыі ўжо спробу зрабілі і ім нічога зрабіць не ўдалося.

Беларускія арганізацыі пашыраць на нашых вёсках трэба не толькі з пачуцьця і патрэбы з гледзішча беларускага, але трэба гэта рабіць і з пачуцьця гуманітарнага і агульналюдзкага. Добрай волі паляк і іншы народзец гэтаму не запярэчыць і напэўна скажа, што беларускую моладзь ад здзічэньня трэба ратаваць беларускай культурна-асьветнай працай.

Наглядач.

Сход грамадзкіх радных і солтысаў.

Дарэва, Баранавіцкага пав. Быў у нашай воласьці агульны сход грамадзкіх радных і солтысаў. Аб гэтым сходзе я і пішу ў сваей карэспандэнцыі.

Прынесьлі мне ад солтыса пісульку з такой заявай: трэбуюць у Дарэва. Я сабраўся і пайшоў. Дарогаю ў Дарэва нагнаў чалавека, які вонкавым выглядам паказваўся, што ён солтыс — нёс „сумку“ з паперамі. Скуль? — пытаю чалавека. З Далматоў! — адказвае. Солтыс?.. Не! — мала ўзважаючы на мяне адказаў мне папуччык і пачаў паясьняць, што солтыса „пасадзілі“ за нейкае слова, ды й надоўга, бо аж на 4 месяцы. У далейшай гутарцы даведваюся, што ў Дараве, куды мы йшлі, мае адбыцца агульны з усяе воласьці сход грамадзкіх радных і солтысаў. Аб гэтым я ня ведаў і ня ведалі грамадзкія радныя з в. Краглёў, бо солтыс аб гэтым нічога не гаварыў. Трэба ведаць, што ў нашай грамадзе былі такія выбары ў грамадзкую раду, што іх можна назваць назначэньнем, а дзеля гэтага нашыя радныя ня маюць паважнейшага значэньня.

У воласьці, у залі, дзе адбываўся сход, я прыглядаўся і цікавіўся зацікаўленьнем радных і солтысаў: большасьць цішком гаворыць аб сваіх справах, некаторыя газэты чытаюць, а іншыя паперы перабіраюць; гавораць між сабою ўсе пабеларуску, але газэт беларускіх у іх ня відаць, найбольш расейскія, а некаторыя трымаюць у руках газэты польскія. Думаю, што мусіць аб беларускіх газэтах нічога ня ведаюць; але гэтак толькі здаецца, бо ў сапраўднасьці, дык усе ведаюць, але беларускія газэты ў валасной канцэлярыі ня чытаюць, бо тут і сакратар, тут пан войт, тут бывае і пан камандант паліцэйскага пастарунку. У польскай газэце знайшлі артыкул аб нашым слаўным Скарыне, але аб тым, што ён ёсьць першы беларускі друкар ня было напісана ані слова.

Пачаўся сход. Сакратар прачытаў распараджэньне старасты, у каторым даны загад грамадзкім радам заняцца чыстатой у вёсках; прыгэтым было сказана, каб і ў вясковых хатах была наведзена чыстата: каб спалі на адпаведных пасьцелях, каб была чыстая падлога, а печ і сьцены былі пабеленыя. Надварэ — на панадворку і вуліцы, каб былі хаднікі. Словам, каб вёскі былі чыстыя, як шклянкі. Даведваемся, што будуць заведзены чатыры тыдні ў год чыстаты: два тыдні ўвосень і два вясной. У часе тыдняў чыстаты будзе езьдзіць сам стараста і прыглядацца, а калі дзе ня будзе праведзена чыстата — будзе караць штрафам. Апрача старасты, будзе даглядаць за чыстатой так-жа і паліцыя.

Гэтак дбае пан стараста аб чыстаце ў нашых вёсках. А мне здаецца, што пан стараста не з таго боку да гэтай справы падходзіць. Тут трэба ўзбудзіць у народзе пазнаньне патрэбы гэтай чыстаты. А да пазнаньня патрэбы даходзіцца не шляхам прыказаў і штрафаў, або паліцэйскіх пратаколаў, але шляхам асьветы. Дык найлепш было-б заахвочваць сялян арганізавацца ў свае культурна-асьветныя арганізацыі—Бел. Інст. Гасп. і Культуры і Т.Б.Ш., даць помач залажыць бібліятэкі-чытальні, выпісаць свае, беларускія газэты і агулам даць шырокую магчымасьць культурна-асьветнай працы. Гэткім шляхам нашыя вёскі ачысьціліся-б ня толькі ад бруду фізычнага, але і ад моральнага.

Сход кончыўся. Радныя разыйшліся. Солтысы асталіся. Дарогай ідучы сяляне разважалі — новыя кары за невыкананьне загаду... і калі яны кончацца... і калі іх ня будзе.

На сабраньні солтысаў сакратар ганіў іх, што мала сабралі грошай на „LOPP“.

За раднымі пайшлі дамоў і солтысы, разважаючы над справай „LOPP“.

В. К.

USIAČYNA

Sołtys moža i nia ŭmieć papolsku!

Niadaŭna ŭ Polščy abwieščana nowaje rasparadžeńnie ministra nutranych spraŭ ab warunkach dziela abniaćcia stanowišča sołtysa ŭ našym Krai.

Zakon z 23 sakawika 1933 h. ab častkowaj źmienie ładu terytoryjalnaha samaŭradu stawić abawiazak umieć papolsku pisać, jak warunak wybaru na sołtysa i jaho zastupnika — padsołtysa. Ciapier rasparadžeńnie ministra nutranych spraŭ spyniaje hety zakon na praciah adnaje kadencyi ŭ wajawodztwach: Nawahradzkim, Paleskim, Wilenskim i Wałynskim, a tak-ža ŭ pawiecie Horadzienskim i Waŭkawyskim, Białastockaha wajawodztwa.

Hetaje rasparadžeńnie ŭžo jość abawiazujučym. Ciapier užo niama kanieśnaj patreby, kab sołtys abo padsołtys umieli pisać papolsku.

U biełaruskich wioskach, peŭnie-ž, pawinny być sołtysami i padsołtysami biełarusy, a biełaruskija sołtysy i padsołtysy pawinny ŭmieć pabiełarusku i hetaha chapaje, kab być sołtysam.

Sołtysy chaj wiedajuć, što jany majuć prawa ŭ wołaściach i hawaryć pabiełarusku i tudy pisać u rodnaj mowie.

Z haspadarčaha žyćcia.

Ad 1932 da 1936 hodu, pawodle statystyki, u našym Krai padniałasia pradukcyja žywioły; hety ŭzrost hadoŭli skaciny padniaŭsia ŭ haspadaroŭ mienšaj abšaram ułasnaści —u haspadarkach da 50 haktaraŭ ziamli. U bolšych haspadarkach za 50 hakt. ziamli i ŭ najbolšych dwaroch pradukcyja skaciny — hadoŭla koniaŭ, bydła, awiec, świniej — u hetych hadoch panizіłasia.

Heta pakazwaje, što wialikija dwary jduć da ŭpadku; a hetym samym stanowicca ŭsim jasna, što wialikija abšary ziamli ŭ adnych rukach mienš dajuć karyści ahulnaj sprawie čymsia ŭ adpawiednaj razdroblenaści.

Dyk i dziela pawyšeńnia ziemlarobskaj pradukcyi treba dwary parcelawać na produktyŭnyja haspadarki.

Aryšty u Brasłaŭščynie.

Nadowiačy ŭ Brasłaŭskim pawiecie, u Widzach i ŭ Bohinskaj wołaści aryštawała palicyja 18 asob. Wilenskija polskija hazety padajuć, što aryštawanyja zapadozranyja ŭ kamunistyčnaj dziejnaści, niekatoryja z aryštowanych užo sudžanyja za kamunizm.

Krywawaja rasprawa.

U našych wioskach paŭtarajucca časta strašnyja zdareńni. Pryčynaj hetaha — moralny ŭpadak, jaki rodzicca z ciemry.

U minułuju niadzielu ŭ Turhielskaj wołaści, Wil.-Trockaha paw., u zašć. Franciškowa, Anton Litwinski zarubaŭ siakieraj swaju žonku i ciešču.

Litwinski z swajoj žonkaj nia žyŭ razam; jana była ŭ swaich baćkoŭ. Kali-ž žonka Litwinskaha pryjšła z baćkami ŭ Franciškawa pa swaje paduški i pa ŭwieś pasah — Litwinski rasprawiŭsia z žonkaj i cieščaj z siakieraj ŭ rukach. Zabojca aryštawany.

Увага! 30.XI. Бел.Хор Р. Шырмы прапяе дзесяць нар. песьняў у польскім Радыё з перадачай на ўсе станцыі ў Польшчы. Пачатак у 9 гадзін вечара. Дакладная праграма будзе пададзена ў наступным нумары.

Закладчыкам, ініцыятарам і душою концэрну зьяўляецца Іван Тыктор, чалавек, які, можна спадзявацца, не сказаў свайго апошняга слова, хаця і сяньня гэта волат на выдавецкім украінскім рынку друкаванага слова. Выдае ён *„Новый Час“* (штодзеньнік), *„Дзвіночок“* — часапіс для дзяцей, *„Комар“* — гумарыстычны часапіс, *„Народня Справа“* — тыднёвік для вёскі, *„Наш Прапор“* — ілюстраваны двудзёвік, *„Наш Лэмко“* — часапіс прысьвечаны краіне і правінцыі украінскай у Галіччыне, што знаходзіцца на рубяжы з этнографічнаю Польшчаю. Шэсьць часапісаў ў руках аднаго чалавека! Да таго трэба яшчэ адцеміць, што пры асобных органах ёсьць рэгулярныя прэміі ў форме штомесячнае кніжкі бэлетрыстычнага зьместу, пры іншых — гістарычнага зьместу і г. д. Між іншым, такім шляхам пабачыў сьвет вялізарны том „Гісторыі Украінскага Войска,“ ды „Гісторыі Украіны.“

Іван Тыктор яшчэ малады, сярэдняга росту, нязвычайна жывы, гутарлівы чалавек. Ня гледзячы на гутарлівасьць, словы паасобныя ў яго падаюць быццам адрэзаныя. Так гаворыць камандзер да жаўнераў у ваенную пару: коратка, ясна, зразумела, тонам ветлівым, адначасна і рашучым. У штодзеннай працы ён не дэспот. Пачаў вельмі скромна. Як кажа сам, быў друкаром, кольпортэрам свайго першага часапісу, сам быў аўтарам. Таланавітасьць у галіне арганізацыйнай, у гандлёвай, знаёмства практычнае псыхалёгіі чалавека і асабліва селяніна, унутраны дэмократызм, прыяцельскія адносіны да супрацоўнікаў і бясконцая, упорыстая энэргія — ўсе гэныя прыметы і сьвомасьці зрабілі Тыктора ўласьнікам концэрну і паставілі паміж тымі людзьмі, якія пакінуць сабе вялікі сьлед у будаўніцтве культуры украінскае.

Дырэктар Тыктор ахвотна гаворыць аб падзеях „Народняе Справы,“ гэнае *„каровячае газэты,“* так кажуць ягоныя крытыкі. А скольki тутака ў арганізацыі працы у „Нар. Справе“ было разумнае палітыкі, псыхолёгічнае тонкасьці. Коратка кажучы, некалькі гадоў таму назад Тыктор апавяшчле, што кожнаму падпішчыку, які заплаціць за ўвесь год за газэту, дае магчымасьць застрахаваць сваю карову. Калі карова здохне ці прападзе, адміністрацыя часапісу будзе плаціць 100 (цяпер 60) злотаў. Калі ўласьнік дарэжа жывёлу — 60 (цяпер 40) зл.

На вёсцы селянін пачатна ня верыць, думае што Тыктор гэта йшчэ адзін з меставых жулікаў. Аднак розум, лёгіка дыктуе гаспадару, што рызыка малое, а калі пачуў ды йшчэ прачытаў у той самай „Нар. Справе,“ што нехта сапраўды дастаў грошы за здохшую карову, дык народ паверыў і сяньня часапіс мае да 40.000 (сорак тысяч) падпішчыкаў, Тыктор выплаціў уласьнікам кароваў да 400.000 (*чатырыста тысяч*) залатых. Незалежна ад прэміі за карову, Тыктор дае пагарэльцам ці пацярпеўшым ад пошасьцяў чытачом пэўную дапамогу ў форме пару дзесяткаў залатых. Чытачы маюць права йграць на лётэрыі, якую наладжвае концэрн. Выйгрышы — якія-ж блізкія селяніну. Можна выйграць плуг, барану, малатарню, воз, можна выйграць 1—2 гэктары зямлі, можна выйграць вопратку і г. д.

Пачатна журналісты, ды й шмат хто з украінскага грамадзянства, шкелілі з Тыктора. „Каровячая Газэта“ гучэла насьмешліва ў вуснах людзей. Сяньня йнакш глядзяць і крытыкі, а аб сялянах дык і няма што казаць. Тыктор гэта сымболь некага магутнага, што дае грошы і грошы не за якую благую работу, а за тое, што селянін чытае вялікі, добра рэдагаваны ў шчыра народніцкім тоне, украінскі тыднёвік.

Тыктор ня кідаў лёзунгаў партыйных. Ён узгадаваў новых чытачоў, не адбіраў нікому іх. Прэса партыйная прыняла яго варожа. Змаганьне пайшло вострае між іншым і з „Ділом.“ Сяньня паміж імі пакт неагрэсыі; трэба думаць, што гэты пакт азначае перамогу концэрну. Была гарачая вайна з кругамі клерыкальнымі (біскуп Хомышын). Сяньня і тыя не нападаюць. Шмат хто пачатна баяўся, што Тыктор хоча рабіць новую партыю, жыцьцё паказала, што ня толькі партыйна-палітычныя лёзунгі патрэбныя ці неабходныя, што працаваць дзеля народу можна ў іншай форме. Концэрн інформуе, ня сварыцца на вёсцы з дзеячамі тых ці іншых кірункаў. Трэба думаць, што вялікая заслуга Тыктора ў галіне ўзгадаваньня і прыдбаньня тысячаў чытачоў украінскага слова па гарадох і што ён ў вялікай меры быў тым, хто выкінуў зусім польскую газэту з вёскі Усходняе Галіччыны.

Твор Тыктора гэта жывы прыклад непераможнае баявое волі народных масаў у іх імкненьні да незалежнага нацыянальнага жыцьця.

Кожны беларускі гаспадар-земляроб чытае адзіны беларускі гаспадарскі часапіс

„САМАПОМАЧ“

Часапіс выходзіць рэгулярна што месяц, зьмяшчае ў сабе ўсякія гаспадарскія рады, весткі і каштуе з перасылкай на год толькі 3 зл.
на паўгоду . . . . 1.75 „
Адрас рэдакцыі: Вільня, Полацкая вул. 9—4.

Redaktar A. Dasiukiewič — Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny ŭ Wilni, Zawalnaja 1 — 2. — Wydawiec A. Šutowič